РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

22 ЛЮТАГА 2025 г. СУБОТА № 37 (30425)

ПЯЦІГОДКА НЕ ТОЛЬКІ ЯКАСЦІ, АЛЕ І ЖАЛЕЗНАЙ ВЫКАНАЛЬНІЦКАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Задачы, якія Прэзідэнт паставіў учора падчас камандзіроўкі ў Смалявіцкі раён перад сваімі ўпаўнаважанымі і памочнікамі, датычацца ўсіх.

(Працяг на 2–3-й стар.)

НА ВАРЦЕ МІРНАГА ЖЫЦЦЯ І СУВЕРЭНІТЭТУ

Дарагія ветэраны!

Паважаныя суайчыннікі!

Таварышы салдаты, сяржанты, прапаршчыкі і афіцэры!

Віншую вас з Днём абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Гэта свята даўно ўжо стала сапраўды народным, і я выказваю самую глыбокую павагу нашым ветэранам — сапраўдным воінам, доблесным героям, якія абаранілі свабоду Радзімы ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама працаўнікам тылу, што наблізілі сваёй працай Перамогу, 80-годдзе якой мы будзем адзначаць сёлета.

Дзякую воінам-інтэрнацыяналістам, якія сумленна і з годнасцю выканалі свой абавязак перад Айчынай, ветэранам Узброеных Сіл, што стваралі новую армію маладой незалежнай Беларусі, усім беларусам, сапраўдным патрыётам, якія забяспечваюць сёння мірнае жыццё краіны, умацоўваюць яе суверэнітэт і незалежнасць.

Асаблівыя словы падзякі адрасую ваеннаслужачым, супрацоўнікам ведамстваў сістэмы забеспячэння нацыянальнай бяспекі. Перакананы, што наша высокатэхналагічная, кампактная і мабільная армія, уся ваенная арганізацыя дзяржавы здольныя адказаць на любыя выклікі часу і з'яўляюцца сёння надзейным шчытом для народа, гарантам міру на беларускай зямлі.

Памятаем герояў, славім ветэранаў і беражом родную Беларусь.

Жадаю ўсім моцнага здароўя, шчасця, міру і дабрабыту.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

ВЫХОЎВАЕМ ПАТРЫЁТАЎ
8–9

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

АКЦЭНТЫ

РЭГІЁН УСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ

Што будзе зроблена ў Прыпяцкім Палессі паводле новай дзяржпраграмы

Пастановай Савета Міністраў Беларусі ад 31 снежня 2024 года № 1072 зацверджана Праграма развіцця раёнаў Прыпяцкага Палесся на 2025—2030 гады. Яна накіравана на фарміраванне доўгатэрміновай асновы ўстойлівага росту эканомікі, а таксама дабрабыту і якасці жыцця насельніцтва раёнаў Прыпяцкага Палесся: Ганцавіцкага, Лунінецкага, Столінскага і Пінскага раёнаў Брэсцкай вобласці, Ельскага, Жыткавіцкага, Калінкавіцкага, Лельчыцкага і Петрыкаўскага раёнаў Гомельскай вобласці.

СТАР. 10

ISSN 1990 — 763X

«ГЭТЫ ГОД І ПЯЦІГОДКА — НЕ ТОЛЬКІ ЯКАСЦЬ. ГЭТА ЖАЛЕЗНАЯ ВЫКАНАЛЬНІЦКАЯ ДЫСЦЫПЛІНА»

Які ўрок Прэзідэнт даў упаўнаважаным і памочнікам

Сельскагаспадарчая тэматыка ў цэнтры ўвагі кіраўніка дзяржавы не толькі ў перыяд пасяўной ці ўборачнай кампаній, а пастаянна. Ён неаднаразова падкрэсліваў, што ад працы на вёсцы залежыць дабрабыт краіны. А праца тут ідзе пастаянна, нягледзячы на сезон і тэмпературу на вуліцы. Нюансаў і пытанняў мноства, і кожнае з іх важнае. Арганізацыі сельскагаспадарчай працы ў зімовы перыяд была прысвечана рабочая паездка Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Мінскую вобласць. У прыватнасці, ён наведаў РУП «Шыпяны-АСК» у Смалявіцкім раёне. Фармат гэтай прэзідэнцкай камандзіроўкі нестандартны — выязны семінар для службовых асоб, якія з'яўляюцца ўпаўнаважанымі прадстаўнікамі кіраўніка дзяржавы ў розных рэгіёнах, а таксама для памочнікаў Прэзідэнта ў абласцях, кіраўнікоў навукова-практычных цэнтраў НАН па земляробстве і жывёлагадоўлі.

«МЫ ЗАБЫЛІСЯ, ШТО МАЛАКО І МЯСА АДСЮЛЬ»

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, чаму было вырашана правесці такі семінар. Працягваецца зімоўка жывёлы, і, каб не ўпусціць з поля зроку праблемы, якія могуць узнікнуць у гэты перыяд, і потым не разбірацца з іх наступствамі, трэба ўлічваць мноства нюансаў. І гэта датычыцца не толькі аграрыяў, але і тых, хто кантралюе і арганізоўвае іх работу. А каб адказныя асобы маглі эфектыўна выконваць свае кантрольна-распарадчыя функцыі, і было вырашана правесці такі семінар. «Мы ж «рыначнікі», глыбока прасунутыя. Мы забыліся аб тым, што малако і мяса, у тым ліку і зімой, — адсюль. І ўпускаем часта праблемы і пытанні зімоўкі», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Дакладную і актуальную інфармацыю ўдзельнікам семінара прадставілі спецыялісты Нацыянальнай акадэміі навук, супрацоўнікі «Шыпяны-АСК». Як заўважыў Прэзідэнт, вучоныя валодаюць самай актуальнай і глыбокай інфармацыяй. А памочнікам і ўпаўнаважаным трэба «ўнікнуць», зразумець сутнасць зімоўкі, каб пракантраляваць арганізацыю працы ў гэты перыяд на месцах з веданнем справы. І параўнаць, як гэта выглядае на фоне найлепшых гаспадарак, да якіх можна аднесці і «Шыпяны-АСК».

«Таму глядзіце, запамінайце. З сённяшняга-заўтрашняга дня ў сваіх абласцях, дзе вы ўпаўнаважаныя і памочнікі, так правядзіце мерапрыемствы, але ўжо не з пункту гледжання вучобы, а з пункту гледжання кантролю і арганізацыі. І на месцах з губернатараў, мясцовых кіраўнікоў спытайце на ўсю катушку. Абагульніце ва ўрадзе ўсё і даложыце мне, як прайшла зімоўка жывёл. Каму — ордэны-медалі, а каму — наадварот», — сказаў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што не кожны ўпаўнаважаны ці памочнік у сілу сваёй асноўнай спецыяльнасці паглыблены ў сельскую гаспадарку. Але веды трэба асвяжыць, папоўніць і дзейнічаць.

«Яшчэ раз падкрэсліваю: гэты год асаблівы, ды і пяцігодка — не проста якасць, канчатковы наш вынік. Гэта жалезная выканальніцкая дысцыпліна.

Калі не будзе дысцыпліны — усё пустое», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

ЧАМУ ВАРТА БРАЦЬ ПРЫКЛАД З «ШЫПЯНЫ-АСК»

РУП «Шыпяны-АСК» заснавана ў 2007 годзе Навукова-практычным цэнтрам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па земляробстве. Гаспадарка спецыялізуецца на вытворчасці малака, вырошчванні і адкорме буйной рагатай жывёлы, вырошчванні збожжавых і зернебабовых культур, рапсу, іх насенняводства, стварэнні кармавой базы для ўтрымання буйной рагатай жывёлы. З 2011 года прадпрыемства з'яўляецца элітгасам па вытворчасці насення збожжавых, зернебабовых, крупяных і алейных культур. Улічваючы такі шырокі спектр тэм, пытанняў, на якія звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, было нямала.

Дырэктар «Шыпяны-АСК» Вадзім Касцяневіч далажыў пра развіццё гаспадаркі і яе перспектывы. Плошча сельскагаспадарчых угоддзяў складае 7168 гектараў, з іх раллі — 5947 га, лугавых угоддзяў — 1221 га. Бальнасць глебы — 31,6. У 2024 годзе ў гаспадарцы атрымалі 11 тысяч тон ураджаю каласавых, 2,5 тысячы тон рапсу і 3,5 тысячы тон кукурузы. «Значыць, летась у вас было ўсё нармальна з ураджайнасцю?» — удакладніў Прэзідэнт. Вадзім Касцяневіч адзначыў, што мінулы год сапраўды склаўся добра. Ён таксама падкрэсліў, што на прадпрыемстве шмат увагі ўдзяляюць нарыхтоўцы кармоў, гаспадарка забяспечана іх запасам на паўтара года. Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся планамі гаспадаркі. Дырэктар расказаў, што ў планах ёсць будаўніцтва новага малочнатаварнага комплексу на тысячу галоў. Ёсць задумкі і на больш далёкую будучыню.

Летась гадавы ўдой на адну карову склаў 9,5 тысячы кілаграмаў, гэта на 262 кілаграмы больш, чым у 2023 годзе. Усё малако з гаспадаркі здаецца класам «экстра». Аляксандр Лукашэнка нагадаў пра свае патрабаванні да камфортных умоў утрымання жывёл і недапушчальнасць падзяжу. На малочнатаварным комплексе «Алесіна», які ўваходзіць у склад «Шыпяны-АСК», частку статка складаюць каровы чырвонай дацкай пароды. Некалькі гадоў таму спецыялісты Акадэміі навук у якасці эксперымента пачалі развадзіць гэту пароду на прадпрыемстве «Вусце». Аднак пакуль вынікі спрэчныя. Кіраўнік дзяржавы спытаў, які эфект ужо дасягнуты і што яшчэ трэба наладзіць у рабоце.

«Гэта пытанне вельмі важнае, таму што Акадэмія навук замахнулася стварыць нам тут «космас» у жывёлагадоўлі. Паглядзім, як ствараем.

Мы адбіралі ў Данііі самых лепшых і плацілі грошы. Прывезлі сюды — бракуем. Тут самая мінімальная павінна быць адбракоўка», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

НЯМА ТЭХНАЛОГІІ — НЯМА МАЛАКА

З дзейнасцю малочнатаварнага комплексу «Алесіна», які ўваходзіць у склад «Шыпяны-АСК», кіраўнік дзяржавы азнаёміўся асабіста. Але найперш — грунтоўная размова аб кармленні і ўтрыманні буйной рагатай жывёлы ў зімовастойлавы перыяд, у тым ліку і на прыкладзе гэтай гаспадаркі. Дырэктар навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук па жывёлагадоўлі Аляксандр Партной падрабязна далажыў, як наладжана гэта работа. «У мінулым годзе мы атрымалі нядрэнны вынік у жывёлагадоўлі — 8,6 мільёна тон малака, з высокай прадукцыйнасцю. Маніторынг зімоўкі паказвае, што станоўчая тэндэнцыя захоўваецца. Я спадзяюся, што яна захаваецца, паколькі запасы і аб'ёмы кармоў сёлета крыху вышэйшыя, чым летась. І якасць іх лепшая, хоць і пагалоўе кароў нязначна зменшылася», — адзначыў ён.

Прэзідэнт заклікаў усіх удзельнікаў семінара казаць праўду, каб бачыць аб'ектыўную карціну і ведаць, якія праблемы трэба вырашаць. «Скажы мне шчыра: ці ёсць праблема ў тым, што мы дзеля захавання колькасці дойнага статка трымаем не кароў, а нейкіх там коз, а то і наогул ялавых і непрыдатных кароў (якія лічацца як каровы, але яны не дояцца), а ў гаспадарках забараняюць іх прадаваць на мясакамбінат, выводзіць са статка, таму што будуць сварыцца за колькасць», — абазначыў праблему кіраўнік дзяржавы. Ён зрабіў акцэнт на тым, што такі падыход катэгарычна непрымальны.

Аляксандр Партной расказаў аб тэхналагічным рэгламенце, які выкарыстоўваюць навукоўцы для арганізацыі ўтрымання буйной рагатай жывёлы. «Мы вывучалі розныя спосабы і тэхналогіі ўтрымання жывёлы. Але наша краіна ад-

розніваецца прамысловым тыпам вытворчасці малака. І гэта правільнае рашэнне, таму што, улічваючы наяўнасць працоўных рэсурсаў, мы павінны ісці па прамысловым шляху», — адзначыў навуковец.

«Гэта значыць, што карова доіцца не 9-10 гадоў, а паўтара-два гады і гэтак далей. І гэта апраўдана?» — удакладніў Прэзідэнт.

Ён расказаў, што на сваёй ферме праводзіць розныя эксперыменты. Адзін з іх паказаў, што карову можна даіць 9—12 гадоў з добрым удоем. Паводле слоў Прэзідэнта, карова можа даіцца мінімум 9 гадоў, калі яе правільна карміць, утрымліваць і лячыць.

А з гэтым не ўсё так гладка ў сельгаспрадпрыемствах. «І я раблю выснову: а ў нас ёсць увогуле навукоўцы, у нас ёсць увогуле спецыялісты? Пакуль я не магу сказаць, што ў Гусакова (старшыня Прэзідыума НАН Беларусі. — **Заўв. Аўт.**) вялікія спецыялісты», — абурыўся кіраўнік дзяржавы. Ён засяродзіў увагу на тым, што на кожным комплексе трэба стварыць для кароў такія ўмовы, каб іх прадукцыйны перыяд быў максімальна працяглым.

Аляксандр Партной таксама далажыў, што на прамысловых комплексах прадугледжана патокава-цэхавая тэхналогія. Жывёлы размеркаваны на тры цэхі па фізіялагічным стане: цэх запускных кароў, цэх расцёлу, або радзільнае аддзяленне, і цэх вытворчасці малака. Таксама, паводле слоў вучонага, карову ў кожны цэх трэба пераводзіць своечасова. «Вось так павінна быць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. І, вядома, трэба старанна сачыць за фізічным станам і здароўем жывёл, уключаць у рацыён тое, што сапраўды неабходна, своечасова і ў патрэбных колькасцях даваць вітаміны і розныя дадаткі. Корм павінен быць даступны жывёлам круглыя суткі.

Аляксандр Лукашэнка і ўдзельнікі семінара азнаёміліся з тэхналогіяй захоўвання кармоў у сіласна-сянажных траншэях, з тэхналогіяй прыгатавання рацыёнаў і рабочых кармоў. Тут важна ўсё: сянаж павінен быць шчыльна накрыты плёнкай, браць яго трэба так, каб не трапіла паветра, якое выклікае гніенне. Цэлая навука, якой павінны валодаць усе, звярнуў увагу Прэзідэнт.

У комплексе «Алесіна» працуе кормараздатчык беларускай вытворчасці, які сам узважвае, змешвае кармы і раздае жывёлам. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што такі апарат павінен быць на кожным комплексе. Кіраўнік дзяржавы падрабязна цікавіўся рознымі нюансамі ўтрымання жывёлы. Ён падкрэсліў, што некаторыя моманты з «Шыпяны-АСК» трэба прыняць да ўвагі пры будаўніцтве новых комплексаў. Як прыклад — падлога ў кароўніках. Як растлумачыў Аляксандр Партной, любое палімернае пакрыццё павінна мець і падсцілку з саломы, каб карове было камфортна і мякка. Вучоны прывёў яшчэ адзін прыклад — тэмпература бетоннай падлогі мінус тры градусы, палімернай падлогі — плюс тры. Чым цяплейшая падлога, тым лепшы кровазварот, тым менш праблем з нагамі і капытамі ў кароў, адпаведна тым здаравейшая жывёла. Кіраўнік дзяржавы даручыў данесці гэта да губернатараў і ўлічваць пры будаўніцтве новых комплексаў.

Задача для ўпаўнаважаных і памочнікаў у абласцях — кантраляваць утрыманне жывёлы з улікам усіх правілаў, агучаных у «Шыпянах-АСК». «Гэта вельмі важна. Галоўнае — дысцыпліна. Гэта павышае тэхналагічную дысцыпліну. Няма тэхналогіі — няма малака, і загубім жывёлу. Паложана па рацыёне — аддай. Палажана, каб пад носам корм быў, значыць, так і павінна быць», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

«ТРЭБА ПАСТАВІЦЬ ЖОРСТКА ПЫТАННЕ, КАБ ТРАКТАРЫ, АЎТАМАБІЛІ БЫЛІ Ў ПАРАДКУ»

Няшмат часу застаецца да старту пасяўной кампаніі. У разгары — падрыхтоўка тэхнікі да гэтага найважнейшага этапу ў сельскагаспадарчым сезоне. «Шыпяны-АСК» самастойна праводзіць увесь комплекс работ па падрыхтоўцы глебы, сяўбе сельскагаспадарчых культур, доглядзе пасеваў. Удзельнікі семінара пазнаёміліся з гэтай практыкай.

«На лінейцы гатоўнасці павінна быць тэхніка. Трэба паставіць жорстка пытанне, каб трактары, аўтамабілі былі ў парадку. Сельгаспрадпрыемствы павінны на лінейку гатоўнасці перш за ўсё паставіць глеба-апрацоўчую тэхніку, якая будзе занятая вясной», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што поўнасцю тэхніка будзе гатова да пачатку пасяўной, да першай паловы сакавіка. А цяпер трэба ацэньваць, як ідуць справы, аналізаваць, колькі яшчэ адзінак тэхнікі трэба прывесці ў парадак. Дысцыпліна павінна быць як у арміі. «Вы павінны ўзяць з сабой добрага спецыяліста, які вам падкажа, як павінна быць. А вы ўжо сваёй уладай спытаеце. Гэта сур'ёзная рэч. Асабліва ў жывёлагадоўлі», — параіў кіраўнік дзяржавы. Напярэдадні пачатку пасяўной пагаварылі і аб тым, што будуць сеяць аграрыі. Генеральны дырэктар навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук па земляробстве Сяргей Краўцоў далажыў аб новых сартах сельскагаспадарчых культур і асаблівасцях іх вырошчвання.

ТРЭБА ЎСКАЛЫХНУЦЬ КРАІНУ

Падводзячы вынікі семінара, Аляксандр Лукашэнка заявіў, што пакуль катэгарычна не задаволены работай упаўнаважаных прадстаўнікоў кіраўніка дзяржавы ў рэгіёнах, а таксама памочнікаў. У сувязі з гэтым задача Адміністрацыі Прэзідэнта — узяць пытанне на кантроль. «Памочнік павінен быць замкнуты на табе, і ты мне дакладваеш аб гэтым, — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрыя Крутога. — Я сёння думаю: можа, змяніць гэту сістэму. Але памочнікаў трэба актывізаваць. Упаўнаважаныя — ну ад выпадку да выпадку, паказухай займаецеся. Але я ведаю, што недапрацоўваеце».

Выніковая задача ўдзельнікам семінара ад Прэзідэнта — ускалыхнуць сёння краіну, каб не было спячкі. «Ваша задача, гавару павайсковаму, — страсяніце краіну праз вертыкаль улады. У гэтым выпадку — зімоўка ў жывёлагадоўлі і падрыхтоўка да вясновай сяўбы, — удакладніў ён. — Мы ганарымся тым, што на больш чым 8 мільярдаў долараў прадалі сельгаспрадукцыі. Гэта цудоўна, але мы можам гэта страціць. Як звычайна бывае: супакоіліся, усё добра — страцілі. Таму трэба, каб, страсянуўшыся, мы мелі сёлета мінімум 9 мільярдаў, а то і 10 ад продажу прадуктаў харчавання. Харчаванне будзе пастаянна даражэць».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што палітычная абстаноўка, якая ціснула на эканоміку ў сувязі з палітыкай ЗША, сёння мяняецца. «Але цешыць сябе не трэба. Мы не ведаем, чаго хочуць ЗША. Кажу гэта, таму што я абсалютна паглыблены ў гэтыя пытанні. Мы не ведаем, чаго яны запатрабуюць ад расіян за спыненне вайны і гэтак далей. Мне здаецца, яны паспрабуюць расіян сутыкнуць з кітайцамі. Вось гэтага расіянам дапусціць нельга», — заявіў ён. Беларускі лідар заўважыў, што сітуацыя можа змяніцца і не на карысць нам. Па яго словах, калі амерыканскія, а потым еўрапейскія кампаніі вернуцца на наш рынак, канкураваць з імі будзе вельмі складана. «Але харчаванне будзе патрэбна ўсім», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота БелТА.
Смалявіцкі раён.

ДЛЯ ПАВЫШЭННЯ ДАБРАБЫТУ РЭГІЁНАЎ

Прэзідэнт Беларусі 21 лютага падпісаў Указ «Аб узмацненні ролі старшынь выканаўчых камітэтаў базавага ўзроўню ў развіцці рэгіёнаў»

Органы мясцовага кіравання адыгрываюць ключавую ролю ў забеспячэнні высокай якасці жыцця. Непасрэднае ўзаемадзеянне з людзьмі дазваляе раённым і гарадскім (гарадоў абласнога падпарадкавання) выканкамам глыбока ведаць патрэбы насельніцтва, своечасова рэагаваць на праблемы і вырашаць увесь комплекс задач па развіцці падведамных тэрыторый.

Указам вызначаны новыя інструменты для павышэння дабрабыту рэгіёнаў і дабрабыту грамадзян праз узмацненне статусу мясцовых выканкамаў і іх старшынь, больш эфектыўнае мясцовае кіраванне, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

У прыватнасці, пашыраны фінансавыя магчымасці выканкамаў базавага ўзроўню для развіцця тэрыторый і задавальнення патрэб грамадзян.

У мэтах выканання мерапрыемстваў у рамках Года добраўпарадкавання дадзены правы актыўна далучаць грамадзян і арганізацыі ў агульную справу па навядзенні парадку ў краіне.

Спрашчаюцца правілы рэалізацыі агульнараспаўсюджаных карысных выкапняў, у асноўным пяску, грамадзянам для ўласных патрэб, а таксама арганізацыям для добраўпарадкавання і ўтрымання тэрыторый, сельскагаспадарчых аб'ектаў.

Па ўзгадненні з рай-, гарвыканкамамі цяпер павінны прымацца рашэнні, якія прадугледжваюць спыненне дзейнасці важных для раёна аб'ектаў або прыпыненне дзейнасці арганізацый. Гэта дазволіць прадухіліць непрадуманае скарачэнне працоўных месцаў і ліквідацыю сацыяльна значных аб'ектаў, такіх, напрыклад, як банкаматы, пошта, прыпынкі грамадскага транспарту і іншыя.

Стратэгічныя сацыяльна-эканамічныя задачы, якія стаяць перад краінай, і тыя глабальныя выклікі, якія даводзіцца пераадольваць, патрабуюць павышэння якасці кіраўніцкай дзейнасці на ўсіх узроўнях. Таму ўказ істотна пашырае кадравыя паўнамоцтвы мясцовых выканкамаў і іх старшынь у адносінах да дзяржаўных органаў і іншых арганізацый, якія дзейнічаюць на адпаведнай тэрыторыі.

Найважнейшай перадумовай паспяховага развіцця цяпер з'яўляецца строгая выканальніцкая дысцыпліна. Таму старшыні рай-, гарвыканкамаў атрымалі права нароўні з выданнем распараджэнняў выносіць пісьмовыя патрабаванні (прадпісанні) аб устараненні парушэнняў заканадаўства і аб прыцягненні да дысцыплінарнай адказнасці работнікаў. Патрабаванні (прадпісанні) могуць быць адрасаваны кіраўнікам ніжэйстаячых выканкамаў і іншых размешчаных на адпаведнай тэрыторыі арганізацый. Невыкананне такіх патрабаванняў (прадпісанняў) прывядзе да адміністрацыйнай адказнасці.

Пры гэтым на старшынь выканкамаў базавага ўзроўню ўскладаецца персанальная адказнасць за распараджэнні, якімі прымаюцца рашэнні аб кадравых узгадненнях, іншыя рашэнні (даручэнні) і пісьмовыя патрабаванні (прадпісанні), якія выносяцца.

Усе гэтыя меры дадуць магчымасць умацаваць уплыў мясцовых органаў улады на сітуацыю ў рэгіёне, павысіць эфектыўнасць работы выканаўчых камітэтаў і іх старшынь, раскрыць рэзервы для якаснага росту ўзроўню жыцця ў краіне.

Указ уступае ў сілу з 1 сакавіка 2025 года.

ИНФОРМАЦИЯ

о проведении повторного электронного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (Организатор торгов и Оператор электронной торговой площадки torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова 5, каб. 321) по поручению коммунального унитарного предприятия «Миноблавтосервис» (Продавец, место нахождения: г. Минск, ул. П. Бровки, 27)

проводит открытый аукцион по продаже

легкового автомобиля TOYOTA LAND-CRUISER, 2010 г. в., цвет – черный, кузов (рама) № JTEBU3FJ50K012062, рег. знак 0586 MI, находящегося по адресу: г. Минск, ул. П. Бровки, 27

Начальная цена с НДС (20%) – 62 112,00 бел. руб. (задаток 10% от начальной цены – **6 211,00 бел. руб.**). **Цена снижена на 20 %.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, torgi.rlt.by. Предыдущая информация опубликована в газете «Звязда» от 25.09.2024 г., 06.11.2024 г., 04.02.2025 г.

Электронные торги состоятся **13.03.2025 г.** в **10.00** на torgi.rlt.by. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.03.2025 г.** до **17.00. Тел. организатора торгов: 8 (017) 516-80-65; 8 (029) 136-31-11. Тел. для осмотра 8 (029) 700-22-11.**

УНП 100802202

ОБЪЯВЛЕНИЕ

ОАО «БЕЛФА» г. ЖЛОБИН

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ

26 марта 2025 г.

ГОДОВОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ.

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2024 год и основных направлениях деятельности Общества на 2025 год.
2. Отчет о работе наблюдательного совета в 2024 году.
3. О результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2024 год.
4. Утверждение бухгалтерской отчетности, бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках за 2024 год.
5. Об источнике покрытия убытков за 2024 год.
6. Утверждение направлений использования прибыли, остающейся в распоряжении Общества (после уплаты налогов, сборов (пошлин), других обязательных платежей) на 2025 год и первый квартал 2026 года.
7. Об изменении Устава Общества и утверждении его в новой редакции.
8. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
9. О размерах вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

Собрание состоится в актовом зале административно-бытового корпуса (2 этаж) Общества по адресу:
Проезд Красный, 2, г.Жлобин, Гомельская область
Начало в 10.00.
Регистрация участников собрания – с 08.00 до 09.45.
Для регистрации при себе иметь следующие документы:
акционеру Общества – паспорт;
представителю акционера – паспорт и доверенность.
Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании, составляется на основании данных реестра владельцев акций по состоянию на 1 марта 2025 года.
С материалами по проведению собрания можно ознакомиться по местонахождению Общества с 6 марта 2025 года.

Наблюдательный совет.

УНП 400076540

РУП «Институт недвижимости и оценки»

(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)

извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Премьерлизинг» (Продавец).**

Электронные торги состоятся 05.03.2025 г.

Лот № 1: Универсам
с инв. № 200/С-86854, 1116,3 кв. м. Витебская обл., г. Витебск, ул. Баграмяна, 10. Земельный участок № 240100000003007642, 0,3158 га. Право аренды.

Обременения: аренда, ипотека.
Подписание договора купли-продажи и его регистрация возможны только при условии получения согласия залогодержателя по договору об ипотеке.
Организатор электронных торгов и Продавец не несут ответственности за незаключение договора купли-продажи с Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) по причине, вызванной обстоятельствами, изложенными выше.
Начальная цена с НДС 20 % – 1 310 497,20 долларов США. Задаток – 427 340,03 руб.
Шаг электронных торгов – 5 %.
Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 28.02.2025 г. в 16.00.

Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57; 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52; torgi@ino.by; Электронный адрес ЭТП: gostorg.by

ДАЛЁКАЯ ДУГА

УЗАЕМНЫ ІНТАРЭС

Мінск — Кампала: задача — дасягнуць дамоўленасці ў эканамічнай сферы

Урадавая дэлегацыя на чале з Прэм'ер-міністрам Беларусі Раманам ГАЛОЎЧАНКАМ знаходзіцца з афіцыйным візітам ва Угандзе. Другі дзень афіцыйнага візіту ў гэту краіну стартаваў з перагавораў кіраўніка беларускага ўрада з прэзідэнтам краіны Ёверы Кагута Мусевені, якія адбыліся ўчора ў яго працоўнай рэзідэнцыі «State House Entebbe».

– Мы вельмі рады быць на гасціннай зямлі Уганды, – падкрэсліў у пачатку сустрэчы Раман Галоўчанка і падзякаваў за запрашэнне наведаць гэту краіну. – Гэта сапраўды жамчужына Афрыкі. Я хачу перадаць вам самыя цёплыя прывітанні і пажаданні моцнага здароўя ад Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі.

Прэм'ер-міністр падкрэсліў, што, накіроўваючы ўрадавую дэлегацыю ва Уганду, беларускі лідар вызначыў канкрэтныя задачы:

– Прэзідэнт вельмі выразна паставіў задачу дасягнуць дамоўленасці аб шляхах развіцця нашых адносін, у першую чаргу ў эканамічнай сферы.

Ён адзначыў, што праграма бачання беларускім бокам развіцця ўзаемаадносін у перспектыве да 2040 года – гэта вельмі рэалістычны і прагрэсіўны план развіцця краіны:

– І мы былі б вельмі рады магчымасці ўдзельнічаць у сацыяльна-эканамічным развіцці Уганды.

Звяртаючыся да прэзідэнта, Раман Галоўчанка канстатаваў, што нашы краіны вельмі падобныя:

– Маюць практычна аднолькавы памер тэрыторыі, але ва Угандзе ў чатыры разы больш насельніцтва (тут каля 40 мільёнаў, у нас – каля 10). Наш валавы ўнутраны прадукт складае 75 мільярдаў долараў і наш экспарт – 45 мільярдаў долараў, з іх 9 мільярдаў – гэта прадукты харчавання.

Раман Галоўчанка звярнуў увагу на той факт, што ва Угандзе выдатныя ўмовы для сельскай гаспадаркі, выдатны клімат і ўрадлівая глеба. У Беларусі крыху іншая сітуацыя, але развітыя кампетэнцыі:

– У нас вельмі неспрыяльныя ўмовы клімату, але тым не менш мы дасягнулі вельмі вялікіх поспехаў у сельскай гаспадарцы і хацелі б дапамагчы Угандзе рэалізаваць свой сельскагаспадарчы патэнцыял. Вы, напэўна, чулі, што мы развіваем вялікія сельскагаспадарчыя праекты ў Зімбабвэ. Паміж нашымі краінамі падпісана праграма індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі Зімбабвэ, яна ўключае пастаўкі сельскагаспадарчай тэхнікі, прымяненне беларускіх сельскагаспадарчых тэхналогій і перапрацоўку прадуктаў харчавання.

Раман Галоўчанка выказаў упэўненасць, што такая каапэрацыя ў сферы сельскай гаспадаркі паміж Беларуссю і Угандай можа прывесці да істотнага росту вытворчасці прадуктаў харчавання і экспарту ў гэтай краіне.

У тэму

Прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка перадаў Ёверы Кагута Мусевені Пасланне ад Прэзідэнта Беларусі.

«Упэўнены ў тым, што сумеснымі намаганнямі мы створым спрыяльную аснову для пераводу беларуска-ўгандыйскіх адносін на новы якасны ўзровень», – гаворыцца ў пасланні.

Кіраўнік дзяржавы разлічвае на працяг асабістых кантактаў з угандыйскім калегам і з задавальненнем гатовы сустрэцца ў Мінску, Кампале або на міжнародных мерапрыемствах.

Кампетэнтна

Першы намеснік міністра сувязі і інфарматызацыі Павел ТКАЧ:

– Ва Угандзе прынята досыць амбіцыйная праграма лічбавага развіцця, якая распрацавана міжнароднымі экспертамі. І мы бачым, што вопыт Рэспублікі Беларусь можа быць вельмі запатрабаваны з пункту гледжання і развіцця інфраструктуры, і аказання паслуг электрасувязі, таму што наш беларускі спадарожнік сувязі Белінтэрсат мае вельмі добрае пакрыццё на тэрыторыі Афрыкі, у прыватнасці Уганды.

З іншага боку, можам аказваць паслугі з пункту гледжання кансультавання і праектавання сетак сувязі. Цікава будзе ўгандыйскаму боку атрымаць таксама і наш вопыт па навучанні спецыялістаў (як доўгатэрміновыя курсы для атрымання паўнавартаснай адукацыі, так і кароткатэрміновыя курсы пад канкрэтныя рашэнні).

Будзе тут запатрабаваны і вопыт нашага Парка высокіх тэхналогій, таму што мэты Уганды ў сферы лічбавізацыі вельмі сур'ёзныя.

Насамрэч, цяпер сапраўды краіны звярнулі сваю ўвагу на Афрыку, таму ў яе няма ніякай прадузятасці, яна досыць адкрытая, праводзіць шматбаковую палітыку.

Літаральна ў мінулым месяцы сюды прыязджала дэлегацыя з Японіі, таксама прапаноўвала свае паслугі, але японцы рухаюцца больш з тэарэтычнага пункту гледжання. А мы гатовыя прапаноўваць практычныя кейсы.

Першы намеснік міністра замежных спраў Сяргей ЛУКАШЭВІЧ:

– Афрыка ў цяперашні момант перажывае рэнесанс. Мы дакладна разумеем, у чым маюць патрэбу краіны гэтага кантынента: у тэхналогіях, у развіцці сельскай гаспадаркі, прамысловага сектара і гэтак далей.

Мы супрацоўнічаем з тымі краінамі, з якімі ўваходзім у групу шматпалярнага свету, краінамі, якія аб'яднаны агульнымі падыходамі справядлівасці, разумнага супрацоўніцтва і несанкцыянаванага ўзаемадзеяння. Уганда ў гэтым плане для нас уяўляе безумоўны інтарэс. Гэта цікавасць вялікая.

Мы добра стартуем у супрацоўніцтве па лініі Міністэрства сельскай гаспадаркі, Міністэрства прамысловасці і Міністэрства замежных спраў.

Па даручэнні міністра замежных спраў Максіма Рыжанкова мы сёння адкрываем офіс ганаровага консула нашай краіны ва Угандзе. Гэта добры знакавы дыпламатычны крок, які дазваляе зблізіць нашы пазіцыі на міжнароднай арэне і закласці аснову нашага далейшага супрацоўніцтва.

ПА ВЫНІКАХ СУСТРЭЧЫ БЫЛІ ПАДПІСАНЫ НАСТУПНЫЯ ДАКУМЕНТЫ

Мемарандум аб узаемаразуменні паміж Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Уганда аб палітычных кансультацыях.

Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Рэспублікі Уганда аб узаемнай адмене віз па дыпламатычных і службовых пашпартах.

Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Рэспублікі Уганда аб стварэнні сумеснага камітэта па гандлёвым і эканамічным супрацоўніцтве.

Мемарандум аб узаемаразуменні паміж дзяржаўным ваенна-прамысловым камітэтам Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам абароны і па справах ветэранаў Рэспублікі Уганда аб ваенна-тэхнічным супрацоўніцтве.

Мемарандум паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Рэспублікі Уганда аб супрацоўніцтве ў сферы харчовай бяспекі.

Мемарандум аб узаемаразуменні паміж Міністэрствам энергетыкі Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам энергетыкі і мінеральнага развіцця Рэспублікі Уганда аб супрацоўніцтве ў галіне мірнага выкарыстання атамнай энергіі.

Мемарандум аб узаемаразуменні паміж Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Уганда аб супрацоўніцтве ў галіне адукацыі.

ВЫНІКІ І ВЫСНОВЫ

ШЫРОКІЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ ІНТЭГРАЦЫІ

Адной з галоўных падзей у знешнепалітычным парадку дня мінулага тыдня стаў візіт беларускай парламенцкай дэлегацыі на чале са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай у Азербайджан. Нашы парламентарыі ўзялі ўдзел у пасяджэнні Азіяцкай парламенцкай асамблеі, на яе пленарным пасяджэнні Наталля Качанава выступіла з прамовай. Таксама кіраўнік беларускай дэлегацыі правяла шэраг двухбаковых сустрэч, у тым ліку з Прэзідэнтам Азербайджана Ільхамам Аліевым і прэм'ер-міністрам Алі Асадавым.

Па выніках візіту Беларусь атрымала статус назіральніка пры Азіяцкай парламенцкай асамблеі. Што гэта дае нашай краіне — разважаюць парламентарыі — члены Савета Рэспублікі.

Сяргей АЛЕЙНІК, старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы:

«Атрыманне Беларуссю статусу назіральніка ў Азіяцкай парламенцкай асамблеі фактычна завяршае цыкл нашага далучэння да ўсіх найбуйнейшых рэгіянальных міжпарламенцкіх структур. Мы ў кастрычніку падалі афіцыйную заяўку на атрыманне статусу назіральніка ў гэтай паважанай арганізацыі. Наша заяўка была станоўча разгледжана ўсімі дзяржавамі — членамі гэтай арганізацыі і атрымала афіцыйнае адабрэнне асамблеі. Асамблея ў Баку праходзіла пад дэвізам «Роля парламенцкай дыпламатыі ва ўмацаванні міжнароднага супрацоўніцтва», і гэта якраз адлюстроўвае імкненне ўсіх краін-членаў і краін-назіральнікаў гэтай арганізацыі — а іх сёння каля 60 — развіваць і ўмацоўваць шматбаковае супрацоўніцтва, садзейнічаць умацаванню рэгіянальнай і глабальнай бяспекі, забяспечваць устойлівае развіццё».

Ігар СЯРГЕЕЎ, член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве:

«Азіяцкая парламенцкая асамблея сёння заклікана вырашаць многія пытанні, адно з якіх — забеспячэнне міру ў Азіі. Таму невыпадкова Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь атрымаў статус назіральніка ў АПА. Бо для нашай краіны мірнае неба — бясспрэчная каштоўнасць, за якую заплаціў беларускі народ. У пытаннях бяспекі і стабільнасці важна выпрацоўваць шляхі вырашэння задач калектыўна і не менш важна — з надзейнымі саюзнікамі».

Наталля ГЛІНСКАЯ, член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:

«Атрыманне статусу назіральніка ў АПА адкрывае перад Беларуссю шырокія перспектывы інтэграцыі ў азіяцкую прастору. Гэта дасць нашай краіне магчымасць умацаваць гандлёва-эканамічныя сувязі, пашырыць дыялог з дзяржавамі-членамі і ўдзельнічаць у распрацоўцы і рэалізацыі сумесных праектаў у самых розных галінах. Гэта не толькі эканоміка, але і навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва, абмен досведам у сферы адукацыі, аховы здароўя, культуры і турызму. Азіяцкі рэгіён — велізарны рынак з эканомікай, якая дынамічна развіваецца, багаты на прыродныя рэсурсы і валодае высокім тэхналагічным патэнцыялам. Супрацоўніцтва з Азіяй дазволіць Беларусі дыверсіфікаваць свае знешнеэканамічныя сувязі, прыцягнуць інвестыцыі, атрымаць доступ да новых тэхналогій і рынкаў збыту».

Таццяна ІГНАЦЮК, член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:

«Удзел дэлегацыі ў мерапрыемствах Азіяцкай парламенцкай асамблеі і атрыманне Беларуссю статусу назіральніка ў гэтай структуры — не проста фармальнасць. Гэта прызнанне нашай краіны як адказнага ўдзельніка міжнародных працэсаў, які выступае за мір, стабільнасць і справядлівы светапарадак. Падтрымка з боку калег з азіяцкіх дзяржаў пацвярджае, што нашы каштоўнасці — павага да суверэнітэту, сацыяльная справядлівасць, увага да патрэб чалавека — знаходзяць водгук на глабальным узроўні. Асобна хацелася б адзначыць важнасць міжпарламенцкага дыялогу. Заканадаўчыя органы, як люстэрка грамадства, павінны працаваць над стварэннем прававых умоў супрацоўніцтва ў такіх ключавых сферах, як адукацыя і ахова здароўя».

НАША ПАЗІЦЫЯ

НЕ ТРЭБА ДЫКТАВАЦЬ НАМ, З КІМ СЯБРАВАЦЬ І ЯКІХ ЛІДАРАЎ ВЫБІРАЦЬ

Беларускія парламентарыі выступілі на пасяджэннях ПА АБСЕ

Дэлегацыя Нацыянальнага сходу Беларусі ў ПА АБСЕ пад кіраўніцтвам старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Сяргея РАЧКОВА брала ўдзел у 24-м зімовым пасяджэнні Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе ў Вене (Аўстрыя).

Выступаючы на пасяджэнні Агульнага камітэта ПА АБСЕ па палітычных пытаннях і бяспецы, Сяргей Рачкоў у рамках агульных дэбатаў агучыў бачанне беларускім бокам прычын беспрэцэдэнтнага крызісу бяспекі на прасторы АБСЕ.

«Калі сцісла — гэта грэбаванне ўзаемазалежнасцю, сумленнымі кампрамісамі і ўлікам інтарэсаў бяспекі адзін аднаго, а таксама адыход ад рэалістычнага погляду на існаванне сфер інтарэсаў і ўплыву, — сказаў Сяргей Рачкоў. — Нягледзячы на агульную канфрантацыйнасць атмасферы ў АБСЕ і яе структурах у апошнія гады, нам усім давядзецца сфакусіравацца на ключавых пытаннях, калі нам неабыякавы лёс

нашай арганізацыі, калі мы хочам адвесці рэгіён ад апошняй рысы, да якой ён усё бліжэй».

Беларусь ніколі не несла пагрозы нікому са сваіх суседзяў, зазначыў парламентарый. «Аднак беспрэцэдэнтныя аднабаковыя прымусовыя меры краін Захаду супраць Беларусі, безагляднае пашырэнне прасторы НАТА, нарошчванне ваеннага патэнцыялу і актывізацыя ваенных вучэнняў каля нашых меж — усё гэта прымушае нас быць прагматыкамі ў ацэнцы гэтых пагроз. Тым больш мы не прымаем спробы, у тым ліку пад прыкрыццём АБСЕ, дыктаваць нам, з кім сябраваць і якіх лідараў выбіраць. Наша дэлегацыя абвяргае ацэнкі сітуацыі ў Беларусі, якія прагучалі ў выступленнях, як не адпаведныя рэальнаму становішчу. Мы паслядоўна і празрыста для міжнароднай супольнасці прымаем вымушаныя меры ў адказ па ўмацаванні ўласнай бяспекі, — падкрэсліў ён. — Гэтак жа паслядоўна мы імкнёмся рабіць унёсак у рэгіянальную бяспеку. Ужо другі год запар Мінск прыняў міжнародную канферэнцыю па еўразійскай бяспецы, прадэманстраваўшы, што мы здольныя ствараць умовы для выпрацоўкі прынцыпаў нашага мірнага суіснавання як у Еўропе, так і ў Еўразіі. Гэтак жа адказна мы падышлі і да арганізацыі канферэнцыі па нелегальнай міграцыі ў Мінску, запрасіўшы ў тым ліку і ўсіх нашых заходніх суседзяў. Іх самаўстараненне ад прапанаванага дыялогу гаворыць само за сябе».

«Больш за тое, захоўваючы дух Хельсінкі і дух Сан-Францыска, мы працягнулі развіваць ініцыятыву Еўразійскай хартыі разнастайнасці і шматпалярнасці ў XXI стагоддзі. Беларусь бачыць гэты дакумент усебаковым і ўсёабдымным, які не супярэчыць Статуту ААН, каб садзейнічаць фарміраванню глабальнага кансэнсусу ў сферы бяспекі. І ў ім павінны быць выкладзены прынцыпы, на якіх усе дзяржавы гатовы будаваць у далейшым мірны парадак. Для прапаноў і дыскусій мы адкрыты», — дапоўніў Сяргей Рачкоў. Ён нагадаў, што сёлета адзначаецца 80-годдзе Вялікай Перамогі над нацызмам, што надае асаблівае значэнне аб'яднальнаму парадку дня ў АБСЕ і сумесным намаганням па пераадоленні выклікаў сучаснасці.

Алег РУМО, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, выступіў на пасяджэнні Агульнага камітэта ПА АБСЕ па эканамічных пытаннях, навуцы, тэхналогіі і навакольным асяроддзі.

Парламентарый засяродзіў увагу калег на фактары, якія ў істотнай меры перашкаджае ўмацаванню гэтай бяспекі, тармозіць эканамічны рост і ўстойлівае развіццё ў рэгіёне АБСЕ. Гэта — санкцыі і аднабаковыя прымусовыя меры. «У апошнія гады Беларусь падвяргаецца беспрэцэдэнтнаму масіраванаму знешняму ціску з выкарыстаннем шырокага спектра дыскрымінацыйных мер. Пазіцыя нашай краіны адносна такіх мер была і застаецца нязменнай: санкцыі незаконныя з пункту гледжання міжнароднага права і Статута ААН. Яны супярэчаць асноўным прынцыпам АБСЕ, наносяць урон эканамічным інтарэсам і дабрабыту дзяржаў і народаў і не садзейнічаюць вырашэнню супярэчнасцяў і вострых праблем. Наадварот, яны толькі пагаршаюць іх», — сказаў Алег Румо.

Парламентарый звярнуў увагу на дзеянні Еўракамісіі ў 2024 годзе па ўвядзенні фактычна забаронных пошлін на беларускую і расійскую сельскагаспадарчую прадукцыю пры іх імпарце ў краіны Еўрасаюза. Гэтыя дзеянні, відавочна, ідуць насуперак прынцыпам і абавязацельствам АБСЕ.

Ад імя беларускага боку Алег Румо заклікаў дзяржавы — удзельніцы АБСЕ адмовіцца ад выкарыстання аднабаковых прымусовых мер, якія супярэчаць духу і прынцыпам арганізацыі. Мінск разглядае ўзаемапаважлівы дыялог як адзіны шлях для збліжэння пазіцый і пошуку сумесных рашэнняў праблем.

Пры гэтым парламентарый заўважыў, што мэты прывядзення эканомікі Беларусі да калапсу санкцыі не дасягнулі.

«ВУП Беларусі расце, мы дыверсіфікуем наш экспарт, устойліва ідзём па шляху імпартазамяшчэння і забеспячэння тэхналагічнай незалежнасці. Разам з тым прызнаём, што без санкцый наша эканамічнае развіццё было б больш дынамічным. Гэтак жа зразумела, што з-за рэстрыкцый пакутуюць і самі еўрапейцы», — сказаў ён.

І падкрэсліў, што са свайго боку Беларусь гатовая ўносіць уклад у вырашэнне сусветнага харчовага крызісу, цалкам падтрымлівае намаганні, накіраваныя на развіццё, і задзейнічанне значнага патэнцыялу АБСЕ для ўмацавання агульнай бяспекі.

Паводле БелТА і прэс-службы Савета Рэспублікі.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, в том числе не завершенных строительством жилых домов, сроки консервации и завершения строительства которых истекли, с одновременной продажей земельных участков в частную собственность

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 24-63-12; (029) 510-07-63; e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.

Лот №1. Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом (фундамент – бетон, площадь застройки – 71 кв. м, процент готовности – 12 %), по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Новкинский с/с, д. Осиновка, ул. Полевая, 6А и земельный участок с кадастровым №221287013101000145, площадью 0,1500 га в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Новкинский с/с, д. Осиновка, ул. Полевая. Ограничения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Осиновское), охранные зоны электрических сетей напряжением до 1000 вольт.

Начальная цена предмета аукциона (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/ зем. участок): **4896,07** (2286,07/2610,00) бел. руб. **Задаток:** 489,60 бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 46,69 %.

Реквизиты для внесения задатка по лоту № 1: р/с: BY87 AKBB 3604 3141 0001 5200 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300977139, код операции 40901. Получатель платежа: Новкинский сельисполком.

Дата, время и место проведения повторного аукциона: **12.03.2025 г. в 15.20, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатка и приема документов: с 8.30 25.02.2025 г. до 17.30 11.03.2025 г.** Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни — с 8.30. до 17.30, по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

Условия повторного аукциона: в течение 10 раб. дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за предмет аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обратиться за государственной регистрацией прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся в организацию по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним; получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство объекта, разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий 6 месяцев с даты осуществления государственной регистрации права на зем. участок; к строительству жилого дома приступить после согласования в установленном порядке проектной документации; осуществить возведение жилого дома в сроки, установленные Указом Президента РБ от 07.02.2006 г. № 87, выполнить ввод жилого дома в эксплуатацию в соответствии с действующим законодательством. **Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества:** земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Инженерные коммуникации и сооружения на земельном участке отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. **Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220.**

Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан РБ), которые в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием предмета аукциона, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Предоставляются: гражданином РБ – копия документа, удостоверяющего личность без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина РБ – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе и доверенность. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников в отношении каждого предмета аукциона. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением документации, необходимой для его проведения, перечисляются на р/с, указанный в протоколе аукциона. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона. Всем участникам предоставляется право ознакомления с документацией, а также возможность осмотра на местности предмета аукциона. Конт. тел.: (0212) 24-63-12; (029) 510-07-63; e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ НА 15 %

Организатор аукциона: ЗАО «Оценка Сервис», г. Гомель, ул. Лепешинского, 1

Продавец: ОАО «БЕЛФА», 247210, г. Жлобин, проезд Красный, 2, УНП 400076540

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 11.03.2025 г., с 11.00 до 12.00

Грузовой седельный тягач MAZ 54323, рег. № ЕА 5351 (инв. № 150-5732), год выпуска – не определен, кузов (рама) № б/н, цвет – серый, пробег – 931 096 км, состояние – удовлетворительное (б/у). **Полуприцеп фургон тентовый MAZ 9758 030,** рег.№3809ЕВ (инв. № 150-5291), год выпуска – 2002, кузов (рама) № Y3M97580020004855, цвет– голубой, состояние- хорошее (б/у). Местонахождение: г. Жлобин, проезд Красный, 2. **Начальная цена с учетом НДС 20 % – 37 230,00 бел. руб.** Задаток **10% от начальной цены** перечисляется на р/с BY10 AKBB 3012 0310 1009 6000 0000, БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, УНП 400076540, получатель платежа – ОАО «БЕЛФА», г. Жлобин. Код назначения платежа – 40901, «Перечисление гарантийного взноса». Детальная информация об электронных торгах, в том числе о порядке их проведения, оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП **www.torgiservis.by**. Контактные данные (тел./факс): 8(0232)51-22-17; **8(029)651-22-19**, 8(029)694-43-89. **E:mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru**

ПАРАДАК ВА ЎСІМ

У Беларусі зацверджаны рэспубліканскі план мерапрыемстваў па правядзенні ў 2025-м Года добраўпарадкавання

Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў ад 18 лютага 2025 года № 97, якая афіцыйна апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале, паведамляе БелТА.

У план уключаны мерапрыемствы па азеляненні, рамонце вулічна-дарожнай сеткі, уладкаванні аўтамабільных і веласіпедных парковак і стаянак, забеспячэнні належнага функцыянавання сістэм пітнога водазабеспячэння, асвятленні вуліц, аб'ектаў сацыяльнага і культурна-бытавога прызначэння, зносе пустых і старых жылых дамоў, падтрыманні фасадаў будынкаў і іх эстэтызацыі, уладкаванні кантэйнерных пляцовак па зборы адходаў і гэтак далей.

Дакументам ствараецца часовы рэспубліканскі штаб па правядзенні ў 2025-м Года добраўпарадкавання. Кіраўніцтва і каардынацыя работы па выкананні мерапрыемстваў плана стануць выконвацца менавіта гэтым штабам. Яго пасяджэнні будуць правадзіцца не радзей за адзін раз у квартал, а рашэнні афармляцца пратаколамі і даводзіцца да дзяржаўных органаў, адказных за правядзенне мерапрыемстваў плана.

Рэспубліканскі штаб разглядае пытанні неабходнасці карэкціроўкі рэспубліканскага плана, нарматыўных прававых актаў для рэалізацыі яго мерапрыемстваў. Старшынёй штаба прызначаны намеснік прэм'ер-міністра Анатоль Сівак.

Адказнымі на рэспубліканскім узроўні вызначаны Кіраўніцтва спраў Прэзідэнта, Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, Міністэрства лясной гаспадаркі, Міністэрства прамысловасці, Міністэрства інфармацыі, Міністэрства транспарту і камунікацый, Дзяржаўны камітэт па маёмасці і іншыя дзяржаўныя органы і арганізацыі, падпарадкаваныя ўраду.

На абласным узроўні адказныя за рэалізацыю мерапрыемстваў абласныя, Мінскі гарадскі выканаўчыя камітэты, а на базавым і першасным узроўнях — гарадскія (гарады абласнога падпарадкавання), раённыя выканаўчыя камітэты і гарадскія (гарады раённага падпарадкавання), пасялковыя, сельскія выканаўчыя камітэты, мясцовыя адміністрацыі раёнаў у гарадах. У гэтых дзяржорганах створаць рабочыя групы, пасяджэнні якіх будуць правадзіцца не радзей чым раз у месяц.

Рэгіянальныя і галіновыя планы па Годзе добраўпарадкавання павінны быць распрацаваны ў месячны тэрмін. МЖКГ даручана да 1 сакавіка 2026-га забяспечыць падвядзенне вынікаў Года добраўпарадкавання з выбарам найлепшых абласцей, раёнаў, населеных пунктаў і прадставіць вынікі ў Савет Міністраў.

Дзяржорганам неабходна прадстаўляць у Мінпрыроды інфармацыю аб ходзе выканання рэспубліканскага плана: штоквартальна — да 15-га чысла месяца, наступнага за справаздачным перыядам, за 2025 год — да 20 студзеня 2026 года.

Мінпрыроды ж будзе інфармаваць Савет Міністраў аб ходзе выканання рэспубліканскага плана штоквартальна — да 20-га чысла месяца, наступнага за справаздачным перыядам, а за 2025 год — да 1 лютага 2026 года.

Фінансаванне мерапрыемстваў рэспубліканскага плана будзе адбывацца за кошт рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў на 2025 год, а таксама ўласных сродкаў арганізацый і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

Пастанова ўступае ў сілу з дня яе прыняцця.

«ЗАГРУЗКАЙ ЗАДАВОЛЕНЫЯ»

За два месяцы «Белавія» перавезла ў Кітай і назад звыш 2300 пасажыраў

Як нагадалі ў кампаніі, урачыстае адкрыццё рэгулярнага рэйса Мінск — Урумчы адбылося ў снежні мінулага года.

Новы напрамак запатрабаваны, і гэта пацвярджаюць першыя вынікі работы. За гэты час рэйсам скарысталіся звыш 2300 чалавек; загрузка напрамку складае каля 70 %; за снежань—студзень дастаўлена 13 тон грузаў.

НАВУКА, ІНАВАЦЫЙНАСЦЬ І КРЭАТЫЎ

Малы і сярэдні бізнес паступальна нарошчвае свой унёсак у эканоміку

Такім меркаваннем падзяліўся **міністр эканомікі Юрый ЧАБАТАР** у інтэрв'ю «Першаму інфармацыйнаму» тэлеканалу.

Як нагадаў кіраўнік эканамічнага ведамства, на сектар МСП прыпадае 30 % ВУП, амаль палова экспарту, падатковых паступленняў, каля 1,4 мільёна працоўных месцаў. Аднак за апошнія дзесяцігоддзі тут адбыліся і істотныя якасныя змены.

— У першыя гады незалежнасці беларускі прадпрымальнік устойліва асацыіраваўся са сферай гандлю. Але цяпер акцэнт у развіцці бізнесу перамясціўся на вытворчы сектар. Сёння каля 30 % прыватных арганізацый працуе ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, будаўніцтве. І гэта доля пастаянна расце, — падкрэсліў Юрый Чабатар.

Паводле яго слоў, малым і сярэднім бізнесам зарэгістравана больш за палову патэнтаў:

— Гэта навука, інавацыйнасць і крэатыў, якія таксама дазваляюць яму нарошчваць свае паказчыкі. Разам з тым мы разумеем, што дадзеныя кампаніі працуюць у цеснай калабарацыі з дзяржаўнымі прадпрыемствамі, што дае магчымасць зарабляць абодвум бакам.

У завяршэнне размовы міністр эканомікі падзяліўся меркаваннем аб доўгатэрміновых перспектывах развіцця сектара МСП:

— Летась зафіксаваны гістарычны максімум стварэння новых камерцыйных арганізацый — каля 15 тысяч. Гэта ў два разы больш, чым у 2023-м. Такая дынаміка — прамы вынік і пераканаўчы доказ высокай эфектыўнасці рэформы прадпрымальніцкай дзейнасці і абноўленага Закона «Аб інвестыцыях».

Па словах міністра, галоўнае — ствараць умовы для далейшага развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва як найбольш мабільнай, інавацыйна ўспрымальнай часткі камерцыйнага сектара эканомікі.

ВЕДАЙ НАША!

Прадпрыемствы Мінпрама возьмуць удзел у мерапрыемстве «Месяц прамысловага турызму»

Акцыю арганізавала Міністэрства спорту і турызму сумесна з Міністэрствам прамысловасці, Нацыянальным агенцтвам па турызме. У мерапрыемстве таксама возьмуць удзел прадпрыемствы канцэрнаў «Беллегпрам», «Белдзяржхарчпрам», Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, растлумачылі ў прэс-службе Мінпрама.

Буйныя прамысловыя холдынгі Мінпрама правядуць дні адкрытых дзвярэй, вытворчыя экскурсіі і раскажуць наведвальнікам пра гісторыю, дасягненні, сучасныя тэхналогіі, якія ўжываюцца, і планы далейшага развіцця прадпрыемстваў. Запланаваны тэматычныя конкурсы і віктарыны з розыгрышамі прызоў.

Месяц прамысловага турызму на прадпрыемствах галіны пройдзе пад адзіным слоганам #Ведай наша з мэтай папулярызацыі гэтага віду турызму.

Інфармацыя пра акцыю будзе размяшчацца на афіцыйных сайтах прадпрыемстваў і ў акаўнтах сацыяльных сетак і месенджарах.

Дарэчы, прадпрыемствы Мінпрама пачалі практыкаваць прамтурызм з 2015 года.

Як расказалі ў ведамстве, з гэтага часу такі від паслуг паказаў запатрабаванасць у спажыўца. Дзеля далейшага развіцця кірунку прадугледжваецца ўкараненне новых форм і метадаў прасоўвання прамысловага турызму.

У профільным міністэрстве дадалі, што ў нашай краіне прамысловы турызм — адзін з самых папулярных відаў турызму. Яго развіццю ўдзяляецца значная ўвага на дзяржаўным узроўні. У рамках міжведамаснага экспертнага савета па турызме пры Савеце Міністраў функцыяную рабочая група па прамысловым турызме. Прамысловы турызм уключаны ў адзіную класіфікацыю відаў турызму ў Беларусі, зацверджаную Міністэрствам спорту і турызму.

УВАГА ДА ДЭТАЛЯЎ

Неабходная карэкціроўка заканадаўства аб прызнанні запазычанасці безнадзейным доўгам

Такім меркаваннем падзяліўся **дырэктар Дэпартамента па санацыі і банкруцтве Юрый ТАРАКАНАЎ.**

Як паведамляе прэсслужба Мінэканомікі, за 2024 год эканамічнымі судамі было ўзбуджана 1258 спраў аб неплацежаздольнасці і банкруцтве, што на 41 % больш, чым у 2023 годзе. Больш за палову спраў аб банкруцтве (58 %) адкрываюцца эканамічнымі судамі па ініцыятыве дзяржорганаў на стадыі, калі ў даўжніка адсутнічае маёмасць.

У гэтай сувязі Дэпартамент па санацыі і банкруцтве прытрымліваецца пазіцыі аб мэтазгоднасці карэкціроўкі заканадаўства ў сферы прызнання запазычанасці безнадзейным доўгам:

— Аналіз практыкі прымянення заканадаўства аб урэгуляванні неплацежаздольнасці за 2024 год выявіў неабходнасць прадастаўлення большых правоў дзяржорганам на прыняцце рашэння аб прызнанні запазычанасці безнадзейным доўгам і яго спісанні па падставах, не звязаных з банкруцтвам.

На яго думку, патрабуецца перагляд умоў такога спісання.

Адпаведныя кансультацыі ўжо праведзены з Міністэрствам па падатках і зборах, Мінпрацы і Вярхоўным Судом.

ПАРАДАК НА ПАЛІЦАХ

МАРГ працягвае вывучаць становішча спраў у гандлі, уключаючы віртуальны

На мінулым тыдні мы пісалі пра тое, што профільнае міністэрства зазірнула ў гандлёвую сетку «Суседзі» і выявіла шэраг парушэнняў. На гэтым — МАРГ апублікаваў інфармацыю аб выніках кантрольна-аналітычных мерапрыемстваў у гандлёвай сетцы «Капеечка» і ўвагі да інтэрнэт-крамы «Вайлдберыз».

Нагадаем, што інтэрнэт-крама «Вайлдберыз» (прадавец ТАА «ИМВБРБ») мае па краіне больш за 2 тысячы пунктаў выдачы заказаў (сваіх і партнёрскіх).

Як паведамілі ў МАРГ, у ведамства і выканкамы са скаргамі на дзейнасць гэтай інтэрнэт-крамы ў 2022 годзе паступіла каля 1,5 тысячы зваротаў грамадзян, у 2023-м — 2 тысячы, у мінулым — 1 тысяча, па стане на бягучы момант — ужо больш за сотню.

— Часта толькі пасля ўмяшання дзяржаўных органаў вырашаюцца спажывецкія праблемы, якія доўжыліся часам месяцамі, — пракаментавалі ў МАРГ.

Профільнае міністэрства выдавала прадаўцу і прадпісанні (у 2022 годзе — 7 прадпісанняў, у 2023-м — 4 і 1 патрабаванне аб забароне продажу забароненых тавараў, у мінулым годзе — 10) і неаднаразова прыцягвала яго службовых асоб (у тым ліку за невыкананне прадпісання МАРГ: у 2022-м — 3 пратаколы, у 2023-м — 4, у мінулым — 3) да адміністрацыйнай адказнасці.

Разам з тым, вывучыўшы інфармацыю на сайце прадаўца, МАРГ зноў выявіла парушэнні заканадаўства аб гандлі і абароне правоў спажыўцоў.

Так, прапануюцца да продажу забароненыя тавары (парфумерыя, касметыка і іншае), вырабленыя ў краінах, якія ўвялі санкцыі і праводзяць недружалюбную палітыку ў дачыненні да Беларусі. Таксама адсутнічае інфармацыя аб многіх вытворцах, якія рэалізуюць тавары.

На галоўнай старонцы інтэрнэт-крамы няма інфармацыі пра спосабы аплаты тавараў.

Акрамя гэтага, грошы вяртаюцца на баланс асабістага кабінета, а не на рахунак спажыўца.

Па гэтай прычыне МАРГ прадпісала «Вайлдберыз» ліквідаваць парушэнні заканадаўства аб абароне правоў спажыўцоў і 19 лютага выдала патрабаванне аб спыненні рэалізацыі забароненых тавараў.

Што датычыцца правядзення кантрольна-аналітычных мерапрыемстваў гандлёвай сеткі «Капеечка», якая належыць ЗАТ «Дабраном», то, паводле звестак гандлёвага рэестра, на тэрыторыі Беларусі адкрыта больш за 1,1 тысячы рознічных гандлёвых аб'ектаў.

Як паведамілі ў ведамстве, па выніках кантрольна-аналітычных мерапрыемстваў парушэнні ўстаноўлены ў 96 % аб'ектах, дзе праводзіўся маніторынг.

Накіраваны рэкамендацыі аб ліквідацыі парушэнняў, выдадзены прадпісанні аб забароне рэалізацыі прадукцыі са скончаным тэрмінам прыдатнасці.

ОАО «Красный Октябрь»
извещает акционеров
о проведении
28 марта 2025 года в 11.00
годового общего собрания по адресу:
г. Витебск, проспект Генерала Людникова, 10/3.

Повестка дня:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2024 год и перспективы развития на 2025 год.
2. Отчет наблюдательного совета о работе в 2024 году.
3. Отчет ревизионной комиссии о работе в 2024 году.
4. Утверждение годового бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2024 год.
5. О распределении чистой прибыли Общества за 2024 год и о выплате дивидендов за 2024 год.
6. О внесении изменений в Устав Общества.
7. О внесении изменений и дополнений в «Положение о порядке определения и учета аффилированных лиц ОАО «Красный Октябрь».
8. Избрание членов наблюдательного совета ОАО «Красный Октябрь».
9. Избрание членов ревизионной комиссии ОАО «Красный Октябрь».

С материалами по вопросам повестки дня акционеры могут ознакомиться в приёмной Общества с 18 марта 2025г. по 27 марта 2025 г. в рабочие дни (понедельник—пятница) — с 8.30 до 12.00 и с 12.30 до 17.00 часов, и 28 марта 2025 г. по месту проведения собрания.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет производиться в день проведения собрания с 10-00 до 10-45.

Список лиц, имеющих право на участие в годовом общем собрании, будет составлен на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного на 1 марта 2025 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера паспорт и доверенность.

Наблюдательный совет
Справки по тел. (8 0212) 48-26-41

УНП 300003144

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
по продаже движимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№2025.Г.002.00052** о продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by/.

Продавец: Инспекция Министерства по налогам и сборам Республики Беларусь по Полоцкому району, 211400, г. Полоцк, ул. Свердлова, 9, тел./факс 8 (0214) 46 56 71.

Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

Дата и время проведения торгов: 24.03.2025 г. в 9.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

Лот № 1. Автомобиль GEELY SC7,

2014 г. в., рег. номер 2341 IA-2 (выданы регистрационные знаки для транспортных средств, временно допущенных к участию в дорожном движении 2EPT3514), тип – легковой автомобиль седан (sedan), кузов (рама) № Y4K8844S3EB001883, цвет – светло-серебристый металлик, пробег – 130564 км, инв. №01510102.

Местонахождение имущества: г. Полоцк, ул. Свердлова, 9.
Начальная цена: 3390,65 бел. руб. без НДС.
Задаток: 339,07 бел. руб.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608, и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» etpvit.by. **Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом ЭТП, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 21.03.2025 г.** Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни — с 09.00 до 16.00, по предварительному согласованию с Продавцом: тел.: +375 (29) 7130447 – Хаткевич Владимир Брониславович.

ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОБЪЯВЛЕННЫХ ТОРГАХ
И ПРЕДМЕТЕ ТОРГОВ

Организатор электронных торгов: комитет «Минскоблимущество», тел. 8 (017) 5004711, 5004710, 5168054, 5168055.
Оператор электронной торговой площадки: открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа».
Электронный адрес электронной торговой площадки: www.et.butb.by.
Дата проведения повторных электронных торгов: 20 марта 2025 г.
Лот № 6. Недвижимое имущество: капитальное строение (инв. № 601/С-24063) – одноэтажное **здание фельдшерско-акушерского пункта,** общ. пл. 60,1 кв.м, 1990 г. п., расположенное по адресу: Минская обл., Логойский р-н, д. Ганцевичи, 13А.
Начальная цена предмета электронных торгов: 4 260,00 руб. *(Начальная цена понижена на 80 %).*
Продавец: Каменский сельский исполнительный комитет.
Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на официальных сайтах Минского областного исполнительного комитета **www.minsk-region.gov.by,** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **www.gki.gov.by.** УНП 600181630

«Организатор торгов
ООО «Правовая компания «АльтЮрКом»
извещает о проведении публичных торгов
в форме аукциона по продаже имущества
ООО «СЭНС-ГЕРАЛЬДИКА» (УНП 191984119)
Дата проведения: 25.03.2025 г. в 12.00

Адрес проведения: г. Минск, ул. Казинца, д. 11А, оф. Б813
Предмет торгов: имущество ООО «СЭНС-ГЕРАЛЬДИКА» (листы АМЦМ, листы Л63 мяг, листы Л90ДПРНМ пр.)
Начальная стоимость: 23 438,10 бел. руб.
Полный перечень имущества и информацию об условиях торгов можно получить по ссылке https://acg.by/realizacziya-imushhestva-torgi/realizacziya-imushhestva-torgi-sens-geraldika/.»

АБАРОНЦЫ

АФІЦЭР У ЧАЦВЁРТЫМ ПАКАЛЕННІ, або Гісторыя дынастыі Вальфовічаў

Кожны чалавек, асабліва калі ён носіць пагоны, адчувае найвялікшы гонар, калі яго дынастыя мае працяг. Прадстаўнікі афіцэрскіх дынастый — асаблівыя людзі, для якіх пераемнасць традыцый, маральныя каштоўнасці, а таксама павышанае пачуццё адказнасці не толькі за сваю сям'ю, а ў цэлым за народ, краіну — не пустыя словы. Здолець усё гэта перадаць сваім нашчадкам, захапіць іх сваёй справай, якая выходзіць за рамкі прафесійных абавязкаў, можа далёка не кожны. У сям'і Вальфовічаў гэта атрымліваецца — прадстаўнік ужо чацвёртага пакалення ваеннаслужачых прысвяціў свой лёс служэнню Айчыне. Напярэдадні Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл мы пагутарылі з начальнікам штаба — першым намеснікам камандзіра 120-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады падпалкоўнікам Максімам ВАЛЬФОВІЧАМ. Максім Аляксандравіч расказаў аб сваіх гераічных продках, шляху да ўласных афіцэрскіх пагонаў. Ён падзяліўся таксама, наколькі адказна быць сынам генерала, чаму важна любіць справу, якой прысвяціў жыццё.

Максім і Аляксандр ВАЛЬФОВІЧЫ.

З ДЗЯЦІНСТВА Ў ТАНКУ І ЗАГАРТОЎКА СУВОРАЎСКІМ

Незайздросны лёс сям'і ваеннаслужачага: пастаянныя пераезды, змена месца жыхарства, новыя калектывы, сябры. Але з самага дзяцінства Максіму гэта падабалася. Мяняліся краіны, гарнізоны, школы, а любоў да прафесіі, якую на працягу многіх гадоў выбіралі ўсе мужчыны сям'і, толькі мацнела.

На адсутнасць бацькавай увагі Максім ніколі не скардзіўся. Каб бачыцца з ім часцей, пасля школы нярэдка забягаў у воінскую часць, дзе той служыў. Па магчымасці старэйшы Вальфовіч браў сына на палігоны, дзе ў Максіма была магчымасць і ў танку праехацца, і патрымаць у руках сапраўдны аўтамат. Тое, аб чым марыць ці не кожны хлопчык, для яго было рэальнасцю.

Жаданне атрымаць афіцэрскія пагоны з кожным днём расло, а тут яшчэ сусед, выхаванец Мінскага суворaўскага ваеннага вучылішча, пачаў распавядаць пра курсанцкія будні. Расказваў так, што і Максіму захацелася: у выніку ў 2003 годзе і ён папоўніў шэрагі суворaўцаў.

«Гэта была выключна мая ініцыятыва, — расказвае Максім Вальфовіч. — Зразумела, у 12 гадоў прымаць такія рашэнні няпроста, у першую чаргу павінна быць падтрымка сям'і. Мама гэтаму не абрадавалася: з улікам таго, што я адно дзіця ў сям'і, яна не хацела са мной надоўга расставацца. Бацька маё рашэнне падтрымаў, але не было такога — «ты павінен», «абавязаны» або «гэта неабходна». Ён сказаў так: «Ёсць жаданне — ідзі, але ты павінен разумець, што калі выбіраеш гэты шлях, то ідзеш да канца. Без адступленняў».

З такім настроем Максім і вучыўся ўсе пяць гадоў. Прызнаецца, было няпроста, але разумеў адказнасць — падвесці бацьку не мог. Ды і наперадзе была мэта, якую ён планаваў дасягнуць, — паступленне ў Ваенную акадэмію.

Максім з цеплынёй згадвае гады, праведзеныя ў суворaўскім вучылішчы. «Каля ста дванаццацігадовых хлопчыкаў (усе абсалютна розныя) у адзін момант сутыкнуліся з новай абстаноўкай, — кажа ён. — Вядома, гэта было няпроста, але ўсе разумелі: нельга пусціць слязу, бо ты знаходзішся ў мужчынскім калектыве і тут цябе не зразумеюць. Як аказалася, пэўныя абмежаванні, у якіх мы знаходзіліся, прыводзяць да станоўчага выніку і ў вучобе. Хочаш пайсці ў звальненне — вучыся. Дрэнна вучышся — значыць, не пойдзеш. Не будзеш прытрымлівацца дысцыпліны — замест звальнення цябе чакае сутачны нарад. Безумоўна, гэта загартоўвала характар, закладваўся мужчынскі стрыжань у пытаннях дысцыпліны, выхавання, самастойнасці».

У 10 і 11 класах Максім сутыкнуўся з чарговым выпрабаваннем: па прычыне таго, што бацька паступіў у Акадэмію Генеральнага штаба Расійскай Федэрацыі, сям'я вымушана была з'ехаць з Беларусі. На сямейным савеце было вырашана: сын працягне вучобу ў суворaўскім. Бачыліся нячаста, але хлопец не застаўся адзін: бацькоў на пэўны час замяніў дзядуля, не давалі сумаваць і таварышы-кадэты.

Па словах ваеннаслужачага, сяброўства, якое завязалася ў Мінскім суворaўскім ваенным вучылішчы, вельмі адрозніваецца. З хлопцамі, з якімі пачыналі спасцігаць тонкасці ваеннага майстэрства, сябруюць дагэтуль. «Мы можам не бачыцца цэлы год, але, калі таварыш мне патэлефануе і скажа, што ў яго ёсць праблема, абавязкова прыйду на дапамогу», — заўважае Максім Вальфовіч.

ШКОЛА ПРАФЕСІЙНАГА СТАНАЎЛЕННЯ

Максіму, як і многім яго таварышам, было прасцей, у параўнанні з учарашнімі школьнікамі, адаптавацца да навучальнага працэсу і побыту ў Ваеннай акадэміі, куды ён паступіў. Сур'ёзная школа суворaўскага вучылішча прайшла недарэмна: асвоеныя за пяць гадоў азы ваеннай справы дазволілі не толькі добра спраўляцца з пастаўленымі задачамі, але і нават дапамагаць таварышам.

Малады чалавек паступіў на агульнавайсковы факультэт, вучыўся па спецыяльнасці «Кіраванне мотастралковымі падраздзяленнямі». Пры выбары роду дзейнасці кіраваўся тым, што хацеў бы быць у гушчы ваеннага жыцця, а гэта значыць пастаянна ўдзельнічаць у баявой падрыхтоўцы, вучэннях, пастаянна кантактаваць з людзьмі, узаемадзейнічаць з тэхнікай. Усё гэта Максіму вельмі падабалася, таму не дзіўна, што на момант размеркавання ў 2012 годзе ён — адзін з лідараў пры выбары першага месца службы. Своеасаблівым бонусам было і тое, што падчас вучобы Максім з'яўляўся намеснікам камандзіра ўзвода, што ў грамадзянскай ВНУ прыраўноўваецца да старасты курса.

У той час, як многія курсанты (як, дарэчы, і студэнты) хочуць застацца ў сталіцы, Максім Вальфовіч імкнуўся служыць падалей ад Мінска, ад бацькоўскай апекі. «На слыху была 6-я асобная гвардзейская механізаваная брыгада, якая дыслацыруецца ў Гродне, — кажа ваеннаслужачы. — Многія імкнуліся туды трапіць. Я не выключэнне».

Мара збылася. Восем гадоў службы ў воінскім падраздзяленні праляцелі незаўважна. Тут Максім набіраўся вопыту, прафесійна сталеў: у Гродне прайшоў шлях ад камандзіра мотастралковага ўзвода да камандзіра асобнага механізаванага батальёна. «Фактычна ўся служба прайшла на палігонах, — успамінае ён. — Гэта пастаяннае навучанне салдат тэрміновай службы, узаемадзеянне з афіцэрскім складам, прапаршчыкамі. Нягледзячы на вялікую нагрузку, ніколі не пашкадаваў аб сваім выбары. Яшчэ раз пераканаўся ў тым, што ва Узброеных Сілах служаць моцныя хлопцы, надзейныя баявыя таварышы».

У 2020 годзе Максім Вальфовіч быў накіраваны на навучанне ў Ваенную акадэмію на факультэт Генеральнага штаба. Пасля яго заканчэння ў 2022 годзе быў размеркаваны ў 120-ю асобную механізаваную брыгаду на пасаду намесніка начальніка штаба — начальніка аператыўнага аддзялення. Праз год яго прызначылі начальнікам штаба ўсяго воінскага падраздзялення.

АФІЦЭР У ЧАЦВЁРТЫМ ПАКАЛЕННІ

Малады чалавек ганарыцца сваімі продкамі. Іх самаахвярнае служэнне Радзіме, гераічныя ўчынкі як у ваенны, так і ў мірны час з'яўляюцца прыкладамі для пераймання.

Пачынальнік ваеннай дынастыі — прадзядуля Максіма. Аляксандр Рыгоравіч Вальфовіч прайшоў Вялікую Айчынную вайну, якую завяршыў у званні старшага лейтэнанта. Як самую дарагую рэліквію праўнук захоўвае яго баявыя ўзнагароды: ордэны Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны I ступені, медалі «За адвагу», «За ўзяцце Берліна», «За вызваленне Прагі», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.»

Сын ветэрана вайны, Рыгор Аляксандравіч пайшоў па слядах бацькі. Ён танкіст. Службу скончыў намеснікам камандзіра 3-га танкавага палка ў званні падпалкоўніка запасу. Максім лічыць, што характарам ён у дзеда. Кажа, што менавіта той сыграў ключавую ролю, калі малады чалавек вызначаўся з будучай ваеннай спецыяльнасцю. «Дзед заўсёды побач, падтрымлівае мяне ва ўсім, — прызнаецца малады чалавек. — Можам пагаварыць на любыя тэмы, дзедавы парады заўсёды каштоўныя, яго меркаванне важнае для мяне».

Прадзед па лініі мамы — Давыд Іванавіч Пінталюшка — таксама ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Характар будучага кадравага афіцэра загартоўваўся падчас рэальных баявых дзеянняў. Скончыць вайну ў баявых радах не дазволіла раненне. Пасля лячэння працягваў службу ў ваенным вучылішчы, у якім служыў да самай адстаўкі. Сярод узнагарод прадзеда — ордэн Айчыннай вайны II ступені і медаль «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.».

Армейскія будні (Максім ВАЛЬФОВІЧ злева).

Дзед Максіма Вальфовіча па матчынай лініі таксама быў кадравым афіцэрам. Службу заканчваў зампалітам 114-га палка 72-й дывізіі (цяпер 72-і аб'яднаны навучальны цэнтр падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў) у званні падпалкоўніка. Ва Узброеных Сілах служаць і два родныя дзядзькі маладога чалавека.

ШЛЯХ ДА ГЕНЕРАЛЬСКІХ ПАГОНАЎ

Галоўным прыкладам для пераймання для Максіма заўсёды быў яго бацька. Для многіх — дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі нашай краіны, генерал-лейтэнант Аляксандр Вальфовіч. Для яго ж — самы надзейны таварыш і найлепшы сябар.

Максім расказвае, што ў свой час прафесійны выбар бацькі нават не абмяркоўваўся: унук героя Вялікай Айчыннай, сын кадравага афіцэра павінен быў працягнуць сямейную дынастыю. А ён і не быў супраць: асяроддзе, у якім выхоўваўся будучы военачальнік, фарміравала стрыжань мужнага чалавека і патрыёта.

«Бацька нарадзіўся ў Казані, але потым сям'я пераехала ў Барысаў, куды перавялі дзеда, тут і засталіся, — расказвае Максім Вальфовіч. — Калі прыйшоў час вызначацца з прафесіяй, дзед хацеў, каб сын быў танкістам, але бацька вырашыў паступіць у Маскоўскае агульнавайсковае каманднае вучылішча».

На адлегласці ад роднага дома, ва ўмовах адсутнасці падтрымкі блізкіх людзей загартоўваўся характар будучага генерала. «Бацька расказваў, што спраўляцца з усімі цяжкасцямі дапамагала моцнае мужчынскае сяброўства, — заўважае сын. — Дагэтуль ён захоўвае альбомы з вучылішча, падтрымлівае адносіны з таварышамі, з якімі вучыўся».

Пасля вучобы малодшага Аляксандра Вальфовіча размеркавалі ў Туркменію. Падчас прыезду дадому ў свой першы адпачынак пазнаёміўся з будучай жонкай. Пасля распаду Савецкага Саюза сям'я вярнулася на Радзіму.

«Час быў складаны, многія сыходзілі з арміі, а ён да канца быў верны прафесіі, — адзначае Максім Вальфовіч. — Быў час у 1990-я, калі мы жылі ў службовай аднапакаёвай кватэры: я, бацькі і сабака, як у сапраўдных ваенных. І заробкі тады былі не самыя вялікія, вельмі эканомілі на ўсім. Але ў бацькі і думкі не ўзнікала сыходзіць з арміі. Спрацаваў закладзены стрыжань: у той прафесіі, якую калісьці выбраў, трэба ісці да канца. Ды і другі момант: тыя, хто носіць пагоны, не служаць за грошы. І мяне так навучылі».

Нягледзячы на тое, што ў Максіма ўжо свая сям'я (дарэчы, жонка Надзея — таксама афіцэр Узброеных Сіл), бацькаву апору ён адчувае заўсёды. «Ён для мяне прыклад для пераймання ва ўсіх справах, — прызнаецца ваеннаслужачы. — Пачынаючы з сямейных пытанняў: вельмі добрыя ў іх адносіны з мамай. Як павінен паводзіць сябе мужчына, якім павінен быць мужам — гэта я таксама пераймаю ў яго. Прыклад і ў службовых пытаннях: усе, з кім я сутыкаюся па службе, добра аб ім адгукаюцца. І я разумею, чаму. Бацька — чалавек слова. Любое пытанне, з якім да яго звернешся, ніколі не пакіне ўбаку. Чым можа — дапаможа: словам, справай, парадай».

Бацьку і сына Вальфовічаў аб'ядноўвае і любоў да спорту: пры любой вольнай гадзіне яны займаюцца лёгкай атлетыкай, зімой, як правіла, становяцца на лыжы. Дома праводзяць час за шахматамі, іншымі інтэлектуальнымі гульнямі.

Максім добра разумее: быць сынам высокапастаўленага военачальніка — вялікая адказнасць. «Імкнуўся і падчас навучання ў суворaўскім, і ў акадэміі працаваць на свой аўтарытэт, менавіта ўласнай працай дасягаць поспехаў у вучобе, службе, — кажа падпалкоўнік. — Разумею, з-за прозвішча да мяне больш пільная ўвага, таму ў мяне няма права нешта не зрабіць або выканаць задачу несвоечасова. Я не магу падвесці ні майго бацьку, ні сваіх гераічных продкаў».

Вераніка КАНЮТА.
Фота з асабістага архіва героя публікацыі.

ГРАМАДСТВА

ВЫХАВАЦЬ ЛЮБОЎ І АДДАНАСЦЬ

Заўтра, 23 лютага, наша краіна традыцыйна адзначыць Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Свята мужнасці і вернасці воінскаму абавязку нясе ў сабе сімвалічнае яднанне мінулага, сучаснасці і будучыні. Напярэдадні на сустрэчы з журналістамі вядучыя спецыялісты ў галіне патрыятычнага выхавання, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый падзяліліся вопытам работы з моладдзю, а таксама прадставілі новыя ініцыятывы і праекты, якія нацэлены на ўзмацненне патрыятычнага духу моладзі і фарміраванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі.

Як расказаў **начальнік другога аддзела ўпраўлення інфармацыі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь, палкоўнік Аляксандр КІСЕЛЬ**, сёння на розных узроўнях шмат робіцца для патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення:

— Ваеннае ведамства мерапрыемствы па патрыятычным выхаванні праводзіць сістэмна і комплексна. Выкарыстоўваюцца для гэтага разнастайныя формы і метады. Напрыклад, у час летніх канікул арганізоўваюцца ваенна-патрыятычныя лагеры на базе злучэнняў воінскіх часцей. За мінулы год такія лагеры наведала больш за 14 тысяч чалавек. Таксама штогод мы праводзім шэраг ваенна-патрыятычных гульняў, сярод якіх ужо вядомыя «Арлёнак», «Зарнічка», «Зарніца». І ахоп дзяцей па ўсёй краіне, якія бяруць у іх удзел, складае больш за 30 тысяч чалавек, — адзначыў ён.

Добра зарэкамендавалі сябе і традыцыйныя формы работы з дзецьмі і моладдзю: урокі мужнасці, дні адкрытых дзвярэй, прафарыентацыйныя мерапрыемствы, урокі міру. Актыўна далучаюць дзяцей і моладзь да работы ваенна-патрыятычных клубаў. Паводле слоў Аляксандра Кіселя, ва Узброеных Сілах на сёння створана ўжо звыш 60 такіх клубаў, што дае магчымасць выхоўваць больш за 2000 юных патрыётаў.

— Акрамя гэтага, рэалізоўваюцца сумесныя праекты з рэспубліканскімі грамадскімі аб'яднаннямі. Напрыклад, з «Патрыётамі Беларусі» на базе Ваеннай акадэміі мы праводзім ваенна-патрыятычны турнір «Выклік». А для студэнцкай моладзі праводзім ваенна-прыкладную гульню «Прарыў». З Беларускім дзіцячым фондам зараз рэалізоўваем акцыю «Ліст салдату», у якім хлопчыкі і дзяўчынкі могуць напісаць ліст нашым ваеннаслужачым, — дзеліцца Аляксандр Кісель. — І нашы армейскія творчыя калектывы важную ролю адыгрываюць у патрыятычным выхаванні. Асаблівай папулярнасцю карыстаюцца тэматычныя пляцоўкі, якія можна наведаць у знакавыя для краіны дні: Дзень Перамогі, Дзень Незалежнасці, Дзень абаронцаў Айчыны...

Дарэчы, сёлета такую лакацыю ўсе ахвотныя змогуць знайсці ў гандлёвых цэнтрах «Сталіца» і «Першы нацыянальны гандлёвы дом». Там пакажуць сучасныя ўзоры ўзбраенняў і ваеннай тэхнікі, можна будзе прымераць форму і абмундзіраванне, паўдзельнічаць у розных конкурсах і пачаставацца салдацкай кашай. Ваенна-тэматычныя пляцоўкі будуць працаваць з 12 да 17 гадзін.

Абмеркавалі таксама інавацыйныя формы і метады работы з моладдзю, уключаючы выкарыстанне сучасных інфармацыйных тэхналогій і сацыяльных сетак для прасоўвання патрыятычных каштоўнасцяў. Разгледзелі і пытанні далучэння моладзі да грамадска карыснай дзейнасці, развіцця патрыятычнага руху, падтрымкі маладзёжных ініцыятыў, накіраваных на захаванне гістарычнай памяці і культурнай спадчыны.

— Патрыятычнае выхаванне — значны фактар жыцця насельніцтва. Як правіла, усе сацыялагічныя апытанні аддаюць пальму першынства інстытуту сям'і ў выхаванні, але не менш важная роля ў гэтым працэсе — за ўстановамі адукацыі, арміяй. Апошняя, напрыклад, у людзей асацыіруецца з выхаваннем, дысцыплінай і прывіццём патрэбных якасцяў. Таму агульны поспех магчымы толькі пры комплексным падыходзе, — такім меркаваннем падзяліўся **намеснік дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце, кіраўнік Цэнтра паліталогіі Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі Мікалай СУХОЦКІ**.

Ён таксама расказаў, што, паводле сацыялагічных даследаванняў, патрыятычнае выхаванне ўваходзіць у топ-3 кірункаў, якія, на думку беларусаў, трэба развіваць у маладзёжнай палітыцы, нараўне з падтрымкай маладых сем'яў і здаровым ладам жыцця. Само паняцце «патрыятызм» таксама набывае ўсё больш станоўчыя асацыяцыі. На першых месцах у апытаных такія вызначэнні, як «жыць і працаваць у краіне», «паважаць дзяржаўную сімволіку і гісторыю Беларусі» і «быць гатовымі ў складаную хвіліну абараніць сваю краіну».

Не абмінулі ўвагай і абмеркаванне бягучай геапалітычнай сітуацыі і яе ўплыву на светаўспрыманне падрастаючага пакалення. Эксперты прадставілі свае ацэнкі існых пагроз, звязаных з распаўсюджваннем радыкальных ідэалогій і спробамі перагляду гістарычных падзей. Акрамя гэтага, прэзентавалі дакладныя меры па ўзмацненні духоўна-маральных каштоўнасцяў і фарміравання ў моладзі крытычнага мыслення.

— Задача грамадзянскага і патрыятычнага выхавання была і застаецца актуальнай для сістэмы адукацыі, для дзяржавы і грамадства. Будучыня нашай краіны ў многім залежыць ад узроўню сфарміраванасці патрыятычных якасцяў нашай моладзі, — зазначыла **начальнік цэнтра сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Акадэміі адукацыі Наталля КАТОВІЧ**. — Патрыятычнае выхаванне — адзін з найважнейшых складнікаў выхавання, таму гэтаму ўдзяляецца вялікая ўвага і ў асноўных дакументах сістэмы адукацыі. У школах праводзяцца інфармацыйныя гадзіны, факультатывы і конкурсы.

Алена ДРАПКО.

ООО «Деловая оценка»
(Организатор аукциона)

по поручению **Калинковичское РайПО** (Продавец) извещает о проведении **5 марта 2025 года** повторного открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 часов, по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

Лот № 1: Капитальное строение с инвентарным номером 333/С-161275, площадью 387,7 кв. м (здание кафе «Калинка», назначение — здание специализированное для общественного питания, составные части и принадлежности: подвал, здание склада), расположенное на земельном участке с кадарстровым номером 322385801101000545, по адресу: Гомельская обл., Калинковичский р-н, Малоавтюковский с/с, аг. Малые Автюки, ул. Мира, 26. В состав лота входит оборудование в количестве 60 ед. Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by**
Начальная цена продажи без НДС – 28 200,00 бел. руб.
Задаток – 282,00 бел. руб.

Лот № 2: Капитальное строение с инвентарным номером 333/С-161277, площадью 307,3 кв. м (здание магазина «Продтовары», назначение — здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности: подвал), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 322385801101000545, по адресу: Гомельская обл., Калинковичский р-н, Малоавтюковский с/с, аг. Малые Автюки, ул. Мира, 26/1. В состав лота входит оборудование в количестве 5 ед. Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by**
Начальная цена продажи без НДС – 17 100,00 бел. руб.
Задаток – 171,00 бел. руб.

Лот № 3: Капитальное строение с инвентарным номером 333/С-161276, площадью 341,7 кв. м (здание магазина «Промтовары», назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности: склад), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 322385801101000545, по адресу: Гомельская обл., Калинковичский р-н, Малюавтюковский с/с, аг. Малые Автюки, ул.Мира, 26/2. В состав лота входит оборудование в количестве 43 ед. Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by**
Начальная цена продажи без НДС – 23 700,00 бел. руб.
Задаток – 237,00 бел. руб.

Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права на предмет аукциона возлагаются на Победителя аукциона.
Продавец: Калинковичское РайПО, г. Калинковичи, ул. Ломоносова, 19. Конт. тел. +375 (232) 34-98-92.
Шаг аукциона – 5% от начальной цены лота в фиксированной сумме.
Для участия в аукционе необходимо: 1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка» р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**
2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов, по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни — с **10.00 до 13.00** и **с 14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 04.03.2025 г. в 17.00.** Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.
Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 (три) дня до его проведения. Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5%. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в сроки согласно заключенному договору купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).
Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36; +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие **«Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор аукциона), по поручению **ОАО «Литвяны-Агро»** (продавец), проводит повторный открытый аукцион по продаже

бани с инв. № 623/С-60963 общей площадью 192 м², расположенной на земельном участке с кадастровым номером 625684206001000265 площадью 0,1328 га (право аренды по 2072 г.), по адресу: Минская область, Узденский район, аг. Литвяны, ул. Школьная, 8Е.

Начальная цена с НДС (20 %) – **3 690,24** бел. руб.
(задаток 10 % от начальной цены – **369,00** бел. руб.).
Стоимость снижена на 80 %.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB301210826001 69330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звезда» от 31.08.2023, 10.11.2023, 16.01.2024, 20.03.2024.

Аукцион состоится **10.03.2025** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **7.03.2025** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17. Тел. для осмотра: 8 (029) 882-76-94, 8 (01718) 60-3-72, 60-3-82.**
УНП 600002346

КАБ АЗЁРЫ БЫЛІ — ЯК ЛЮСТЭРКА

Адна з новых задач па добраўпарадкаванні для Мінпрыроды — вырашэнне праблемы дэградацыі і зарастання трыснягом паверхневых водных аб'ектаў

Маштабныя меры па навядзенні парадку на зямлі, уладкаванні населеных пунктаў, вытворчых аб'ектаў, падтрыманні ў належным стане тэрыторый уздоўж аўтамабільных і чыгуначных дарог запланаваны сёлета ў рамках Года добраўпарадкавання. Аднак, перш чым брацца за новыя праекты, неабходна прааналізаваць вынікі праведзенай работы. У Рэспубліканскім цэнтры экалогіі і краязнаўства адбылося пасяджэнне калегіі Мінпрыроды «Аб выніках работы Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь за 2024 год і задачах на 2025 год».

Кіраўнік Мінпрыроды Сяргей МАСЛЯК падрабязна прааналізаваў праблемныя пытанні прыродаахоўнай галіны. Вялікая ўвага была аддадзена такім кірункам работы, як стан атмасфернага паветра і водных рэсурсаў, абыходжанне з адходамі, распрацоўка мінеральна-сыравіннай базы, навядзенне парадку на зямлі, ахова і выкарыстанне зямель, лясоў, жывёльнага і расліннага свету, міжнародная і экаасветніцкая дзейнасць.

Так, адной з задач, якія рэалізуюцца ў рамках выканання даручэння Прэзідэнта па інтэнсіфікацыі мінеральна-сыравіннай базы, з'яўляецца кантроль рэкультывацыі ўнутрыгаспадарчых і прамысловых кар'ераў. Для яго ўдасканалення праведзена работа з кадрамі і тэрытарыяльнымі органамі Мінпрыроды, укараняюцца сучасныя тэхналагічныя сродкі: спецыялізаванае абсталяванне, праграмнае забеспячэнне, беспілотныя лятальныя апараты і г. д. У Мінскім раёне рэалізуецца пілотны праект з выкарыстаннем GPS-трэкераў і дронаў, якія дапамагаюць выяўляць парушэнні землекарыстальнікаў.

У пасяджэнні ўдзельнічалі намеснік прэм'ер-міністра Юрый Шулейка, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Наталля Якубіцкая, прадстаўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю, Генеральнай пракуратуры, рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання.

У цэлым работу сістэмы Мінпрыроды Сяргей Масляк ацаніў як здавальняльную. У Год добраўпарадкавання Мінпрыроды распрацаваны праект Рэспубліканскага плана мерапрыемстваў, які прадугледжвае вялікі набор задач па навядзенні парадку ва ўсіх рэгіёнах Беларусі, а таксама замацаванне адказных на ўсіх узроўнях. Устаноўлены дастаткова напружаныя, але выканальныя паказчыкі.

— Былі сфарміраваны паказчыкі, якія ўключаюць у сабе як пасадку зялёных насаджэнняў, так і добраўпарадкаванне населеных пунктаў, капітальны рамонт дарожнага пакрыцця, — адзначыў міністр.

Паказчыкі Рэспубліканскага плана па навядзенні парадку на зямлі былі прапанаваны на падставе аналізу параметраў, дасягнутых Мінпрыроды летась, з ростам у 10-15 % і даведзены да ўсіх зацікаўленых. Напрыклад, у 2025 годзе будзе высаджана амаль 400 тыс. дрэў, больш за 500 тыс. кустоў і 30 млн кветак.

Дарэчы, адна з новых задач па добраўпарадкаванні — вырашэнне праблемы дэградацыі і зарастання трыснягом паверхневых водных аб'ектаў. Гэты працэс выкліканы сезоннымі і гадавымі ваганнямі аб'ёму рачнога сцёку і ўзроўню вады ў сувязі са змяненнем клімату. У асноўным праблема датычыцца азёр, якія знаходзяцца паміж населенымі пунктамі: у 79 з іх доля зарастання — да 50 %. Адказнымі за выпрацоўку дакладнага плана дзеянняў (абследаванне вадаёмаў, закупку машын, навучанне спецыялістаў і г. д.) і пошук аптымальнага выйсця вызначаны аблвыканкамы.

Александрына ПАРШЫНА.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

РЭГІЁН УСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У рамках прэс-канферэнцыі ў Доме прэсы абмеркавалі ключавыя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна за мінулыя гады. Асобна адзначылі планы па рэалізацыі дзяржаўных праграм і інвестыцыйных праектаў, накіраваных на павышэнне ўзроўню жыцця насельніцтва і ўстойлівае развіццё тэрыторый Прыпяцкага Палесся.

Развіццё гэтага рэгіёна, па словах **начальніка галоўнага ўпраўлення рэгіянальнага развіцця і маёмасных адносін Міністэрства эканомікі Таццяны АНДРЭЕВАЙ**, пад пастаянны увагай кіраўніка дзяржавы. Першая дзяржпраграма развіцця Прыпяцкага Палесся была прынята ў 2010 годзе і дала свае станоўчыя вынікі. Цяпер, у пяцігодку якасці, развіццё Палесся бачыцца праз прызму шэрагу кірункаў: эканоміка высокай якасці, стварэнне ўмоў для развіцця найлепшых чалавечых якасцяў праз паляпшэнне здароўя, павышэнне адукацыйнага і культурнага патэнцыялу людзей і, вядома, камфорту іх пражывання.

Прамысловасць

Плануецца рэалізаваць шэраг буйных вытворчых праектаў. На дадзеным этапе ў найбольшай ступені гатоўнасці — праекты ААТ «Лунінецкі малочны завод», СТАА «БелСыр» у Калінкавічах. Таксама завяршаецца арганізацыя біяфармацэўтычнай вытворчасці ў Ганцавічах. Запланавана мадэрнізацыя шэрагу прамысловых прадпрыемстваў.

АПК

Акцэнты зроблены на чатыры кірункі. Сярод іх — укараненне найлепшых тэхналогій і вопыт вядзення сельскай гаспадаркі з улікам напрацовак ААТ «Парахонскае» Пінскага раёна. Для гэтага вызначаны 9 базавых гаспадарак у кожным раёне. Яшчэ адзін кірунак — захаванне і павышэнне ўрадлівасці зямель, правядзенне меліярацыі. Важным таксама з'яўляецца будаўніцтва, мадэрнізацыя, рэканструкцыя жывёлагадоўчых аб'ектаў. Такія аб'екты з'явяцца як у базавых, так і ў іншых гаспадарках Палескага рэгіёна. Апошняе — развіццё эфектыўнага агародніцтва і садоўніцтва. Палескі рэгіён валодае ўнікальным патэнцыялам для вырошчвання сельскагаспадарчых культур.

Ахова здароўя

Плануецца рэканструяваць Ганцавіцкую ЦРБ, пабудаваць інфекцыйны корпус у Пінскай ЦРБ, Лунінецкай паліклініцы, рэканструяваць філіял Давыд-Гарадоцкай бальніцы, галоўны корпус паліклінікі, дзіцячыя інфекцыйныя карпусы Столінскай ЦРБ, галоўны корпус Жыткавіцкай ЦРБ. Таксама запланаваны капітальны рамонт аб'ектаў аховы здароўя ў Жыткавіцкім, Калінкавіцкім, Лельчыцкім раёнах. Гэта дазволіць насельніцтву рэгіёна атрымліваць якасныя медыцынскія паслугі.

Адукацыя

У 2025 годзе завершыцца ўзвядзенне прыбудовы да сярэдняй школы № 1 у Лунінцы, там жа будзе створана 660 вучэбных месцаў. У Пінскім раёне прадугледжана будаўніцтва Галіцкай пачатковай школы на 100 месцаў, у Столінскім раёне, у Альшанах, будзе ўзведзена сярэдняя школа на 765 месцаў. Для таго каб моладзь заставалася жыць і працаваць у рэгіёне, будуць стварацца ўсе магчымыя ўмовы. Будзе праведзены капітальны рамонт і мадэрнізацыя ўстаноў дашкольнай адукацыі ў Ганцавіцкім, Жыткавіцкім, Лельчыцкім, Калінкавіцкім раёнах.

* * *

